# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Газета Беларускага дзяржаўнага універсітэта, 15 кастрычніка 1998 года, чацвер, № 14 (1787)

СУСТРЭЧЫ

## СЛОВА МАЙСТРА

*28 верасня на факультэце міжнародных адносін адбылася сустрэча студэнтаў з народным артыстам СССР і РБ, лаўрэатам многіх нацыянальных і міжнародных прэмій, мастацкім кіраўніком і дырэктарам тэатра балета Беларусі Валянцінам Елізар'евым.*

Кожны, хто прыйшоў на сустрэчу, не пашкадаваў. Убачыць на ўласныя вочы чалавека, які змяніў звычайныя ўяўленні аб балеце, зрабіў яго мастацтвам, сугучным праблемам чалавецтва XX стагоддзя, творчасць якога з'яўляецца візітнай карткай Беларусі ў дзесятках краінаў свету — магчымасць вельмі рэдкая, а тым больш атрымаць адказы на ўсе свае пытанні аб балеце, мастацтве, жыцці. Шчырай размове спрыяла цёплая, сяброўская атмасфера, што панавала ў зале.



*Той, хто прыйшоў, не пашкадаваў*



*Слова Майстра*

Ёсць і яшчэ аргумент «за» арганізацыю падобных сустрэч: нельга ўявіць сабе дыпламата, які прадстаўляе інтарэсы Рэспублікі Беларусь у іншых краінах і не ведае аб выдатных дасягненнях свайго народа, сваёй Радзмы. Перш за ўсё ў галіне культуры.

На памяць аб наведванні БДУ дэкан факультэта міжнародных адносін прафесар А. В. Шарапа ўручыў госцю памятны падарунак — фотаальбом.

*Леанід ФЯДОТАЎ*

КАНФЕРЭНЦЫІ

## Навука ў ВНУ, прамысловасць, міжнароднае супрацоўніцтва

Гэтымі днямі ў БДУ праходзіць другая навукова-практычная канферэнцыя і выстава “Навука ў ВНУ, прамысловасць, міжнароднае супрацоўніцтва”.

На канферэнцыі працуюць секцыі: стан і перспектывы развіцця фундаментальных і прыкладных даследаванняў у ВНУ рэспублікі, міжнароднае супрацоўніцтва ў галіне навукі і тэхналогій (рэальнасць, праблемы, перспектывы), праблемы абароны інтэлектуальнай уласнасці, адукацыя і адукацыйныя тэхналогіі.

У рамках апошняй секцыі праходзяць семінары “Інфармацыйныя тэхналогіі ў адукацыі”, “Тэарэтыка-метадалагічныя праблемы універсітэцкай адукацыі”, “Дыдактыка вышэйшай школы”.

Акрамя таго, абмяркоўваюцца праблемы ўзаемадзеяння вузаўскай навукі і прамысловых прадпрыемстваў, навукова-інавацыйнай дзейнасці спецыялістаў-прадпрымальнікаў інавацыйнага профілю.

ВЫ ЧУЛІ?

## Мы гуляем у КВЗ

Нядаўна ва універсітэце прайшлі паўфінальныя гульні каманд КВЗ Белдзяржуніверсітэта. У першы дзень сустракаліся студэнты філасофска-эканамічнага, юрыдычнага і механіка-матэматычнага факультэтаў. У другі — спаборнічалі ў весялосці і знаходлівасці каманды геаграфічнага, факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі і яшчэ адна маладая каманда з філасофска-эканамічнага факультэта.

Пераможцы паўфінальных гульняў — каманды філасофска-эканамічнага і факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі — праз месяц-другі будуць змагацца за першынства ў фінале. А каманды геафака і мехмата — за 3-е месца.

КРУГЛЫ СТОЛ



# Напалеонаўскія Войны

15 кастрычніка на гістфаку адбудзецца кргулы стол «Наполеонаўскія войны. Да пытання аб узнаўленні Вялікага княства Літоўскага. Войска ВКЛ: міф ці рэальнасць».

Акрамя выкладчыкаў і навукоўцаў Белдзяржуніверсітэта і педуніверсітэта, удзел у ім прымуць прадстаўнікі Адміністрацыі Прэзідэнта, Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі, Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук, а таксама студэнты і навучэнцы гістарычнага класа ліцэя пры БДУ.

Ганаровым госцем круглага стала будзе Фернанд Бакур, доктар права і гісторыі, дырэктар Цэнтра Напалеонаўскіх даследаванняў.

Адказны за арганізацыю мерапрыемства дацэнт кафедры крыніцазнаўства і музеязнаўства К. І. Казак запрашае да ўдзелу ўсіх ахвотных. У чытачоў «Беларускага універсітэта», што па якіх-небудзь прычынах не змогуць паўдзельнічаць у круглым стале 15 кастрычніка ў 15.00 у зале 44 на гістфаку, ёсць магчымась атрымаць звесткі аб французска-беларускім супрацоўніцтве, прачытаўшы матэрыял «Французскі доктар Фернанд Бакур» на 5-й старонцы.

САМАКІРАВАННЕ

# Вучоба для студсаветаў

У верасні ва ўсіх студэнцкіх інтэрнатах Белдзяржуніверсітэта прайшлі выбары ў органы студэнцкага самакіравання – студэнцкія саветы.

Пачынаючы з 7 кастрычніка, на базе студэнцкага гарадка штотыднёва будзе праводзіцца вучоба старшыняў студсаветаў і камандзіраў аператыўных атрадаў інтэрнатаў па пытаннях развіцця студэнцкага самакіравання, узаемаадносін з адміністрацыяй інтэрната, Белдзяржуніверсітэта, дэканатамі, службай бяспекі.

Ніжэй падаецца спіс каардынацыйнага савета студэнцкіх саветаў інтэрнатаў.

| Інтэрнат | Старшыня студсавета | Камандзір аператыўнага атрада |
|---|---|---|
| № 2 | Міхаіл Чарапеннікаў, хімфак, 4 курс, пакой 206 а | Павел Клімук, хімфак, 3 курс, пакой 314 б |
| № 3 | Наталля Верамчук, ФПМІ, 5 курс, пакой 1310 б | Мікалай Бандзюк, ФПМІ, 5 курс, пакой 912 а |
| № 4 | Віталь Жукоўскі, юрфак, 5 курс, пакой 401 | Дзмітрый Заплешнікаў, юрфак, 3 курс, пакой 404 |
| № 7 | Ігар Шаўцоў, ММФ, 4 курс, пакой 1015 а | Аляксандр Шчарбіна, юрфак, 5 курс, пакой 217 а |
| № 9 | Аляксандр Чубрык, ФЭФ, 4 курс, пакой 53 | Андрэй Заўелаў, ФЭФ, 1 курс, пакой 46 |
| № 10 | Руслан Макарскі, ФРФіЭ, 5 курс, пакой Б061Б | Сяргей Астапчук, ФРФіЭ, 5 курс, пакой Б063А |

Каардынатар – Аляксандр Лабкоў

ДОБРЫЯ ВЕСТКІ

# Апякунскі савет у дзеянні

Нядаўна ва універсітэце створана грамадскае аб'яднанне "Апякунскі савет студэнцкага гарадка БДУ". Старшыня Цэнтральнага Савета аб'яднання – намеснік прарэктара па сацыяльных пытаннях, дырэктар студгарадка Ігар Раманавіч Вярэнчыкаў.

Па словах выканаўчага дырэктара апякунскага савета Ірыны Васільеўны Талстых, сярод асноўных накірункаў дзейнасці савета – арганізацыя выхаваўчага працэсу ў студэнцкіх інтэрнатах, забеспячэнне прававой і сацыяльнай абароны членаў савета, іх матэрыяльная падтрымка, дапамога студэнтам-сіротам, студэнтам са шматдзетных сем'яў, арганізацыя паездак, выстаў, спаборніцтваў, семінараў.

Членам грамадскага аб'яднання можа стаць кожны, хто пажадае. Уступны ўзнос для фізічных асоб складае 0,5 мінімальнага заробку, членскія ўзносы – 0,3 мінімальнага заробку, для юрыдычных асоб – 10 і 8 мінімальных заробкаў адпаведна.

Дарэчы, некаторыя ўжо сталі членамі апякунскага савета. Гэта зрабіла ТАА «Джанатан». Стаматалагічная паліклініка распрацавала сумесную праграму прафілактыкі стаматалагічных захворванняў. 17 студэнтам, якія з'яўляюцца сіротамі, будзе бясплатна аказвацца медыцынская дапамога. Астатнія студэнты БДУ будуць плаціць за стаматалагічныя паслугі на 30 працэнтаў менш. Акрамя таго, усе яны атрымаюць магчымасць прайсці бясплатна медыцынскі агляд.

Распрацоўваецца сумесная праграма і з касметалагічным цэнтрам, што размешчаны ў інтэрнаце № 4 на праспекце Машэрава.

Для тых, хто жадае стаць членам апякунскага савета ці атрымаць больш падрабязную інфармацыю, прапануем тэлефон: 227-11-05.

З ГІСТОРЫЯЙ НА "ТЫ"

## ГЭТЫ ДЗЕНЬ У ЖЫЦЦІ УНІВЕРСІТЭТА

18.10. — 55 год з дня нараджэння Генадзя Рыгоравіча Дзмітрыева, беларускага паэта, які скончыў БДУ ў 1970 годзе. Настаўнічаў. З 1986 — дырэктар Бюро прапаганды мастацкай літаратуры Саюза пісьменнікаў Беларусі.

19.10. — 60 год з дня нараджэння беларускага гісторыка Алы Яфімаўны Казлоўскай. Кандыдат гістарычных навук. Даследуе гісторыю рабочага класа і культуру будаўніцтва Беларусі.

19.11. — 20 год з дня правядзення першых Пічэтаўскіх чытанняў, якія зараз сталі традыцыйнымі.

20.10. — 50 год з дня адкрыцця студэнцкага клуба БДУ.

21.10. — 20 год (1978) з дня адкрыцця мемарыяльнай дошкі ў гонар У. І. Пічэты на кафедры паўднёвых і заходніх славян Маскоўскага універсітэта.

22.10. — 65 год з дня нараджэння Ігара Міхайлавіча Дабралюбава, беларускага кінарэжысёра. Заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі. Скончыў БДУ, затым Усесаюзны дзяржаўны інстытут кінематаграфіі. Працуе на кінастудыі «Беларусьфільм». Аўтар вядомых фільмаў «Іван Макаравіч», «Расклад на паслязаўтра», «Па сакрэту ўсяму свету».

22.10. — 15 год з дня арганізацыі кафедры аўтаматызацыі навуковых даследаванняў.

24.10. — 70 год з дня нараджэння Адама Яўгенавіча Супруна, беларускага мовазнаўцы. Доктар педагагічных навук, прафесар (1967). З 1966 года працуе ў БДУ. Загадчык кафедры агульнага і славянскага мовазнаўства. Заслужаны дзеяч навукі Беларусі.

25.10. — 25 год з дня стварэння кафедры археалогіі, этнаграфіі і дапаможных гістарычных дысцыплін на гістарычным факультэце.

26.10. — 15 год з дня стварэння кафедры атамнай фізікі і фізічнай інфарматыкі фізічнага факультэта.

29.10. — 75 год з дня стварэння ва універсітэце таварыства «Прэч непісьменнасць».

30.10. — 75 год з дня адкрыцця пры БДУ першай студэнцкай сталовай на 800 месцаў.

30.10. — 45 год з дня правядзення Першай штогадовай агульнауніверсітэцкай спартакіяды з запрашэннем каманд іншых ВНУ.

*Рубрыку вядзе А. ЗЕЛЬСКІ, загадчык музея гісторыі БДУ*

АФІЦЫЙНА

Дзеля забеспячэння прадстаўніцтва студэнтаў у органах кіравання Белдзяржуніверсітэта рэктар БДУ, прафесар А. У. Казулін сваім загадам № 2890-Л ад 30 верасня 1998 года ўвёў у састаў Савета Белдзяржуніверсітэта старшыню Савета старастаў БДУ студэнта механіка-матэматычнага факультэта Сакольніка А. Л.

ШТО НОВАГА?

## Кампанія «Інтэл» дапамагае беларускім студэнтам

З мінулага тыдня Беларускі дзяржаўны універсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі па сваёй камп'ютэрнай аснашчанасці заняў месца ў адным шэрагу з Кембрыджскім універсітэтам, Масачусецкім тэхналагічным інстытутам, а таксама МДТУ імя Баўмана і МДУ.

Гэтыя ВНУ сусветна вядомая кампанія «Інтэл» — буйнейшы вытворца мікрапрацэсараў — выбрала ў якасці базавых для ажыццяўлення сваёй акадэмічнай праграмы.

Шчодры падарунак беларускім студэнтам уяўляе сабой камп'ютэрную лабараторыю, аснашчаную 14 працоўнымі станцыямі на базе самага сучаснага працэсара «Пентыўм-II» з тактавай частатой 400 мегагерц. Гэтыя ПК, а таксама сервер «Пентыўм II Ксеан», які ўваходзіць у склад лабараторый, аб'яднаныя ў лакальную сетку з магчымасцю выхада ў Інтэрнэт.

Калі паспрабаваць правесці аналогіі, дык гэта тое ж самае, калі б на аўтамабільным факультэце палітэхнічнага інстытута для трэніровак студэнтам выдалі навейшыя «Мерседэсы» і «Ферары». Вышэй за працэсар «Ксеан» з частатой 400 мегагерц свет яшчэ не бачыў, і прадстаўнік кампаніі Аляксандр Паладзін падкрэсліў, што ні ў адной з ВНУ Усходняй Еўропы падобных камп'ютэраў яшчэ няма.

У свой час Беларусь лічылася кузніцай кадраў савецкіх спецыялістаў у галіне інфарматыкі. Ёсць усе падставы меркаваць, што атрымаўшы зараз доступ да навейшых камп'ютэрных тэхналогій студэнты БДУІР стануць вартымі пераемнікамі гэтай традыцыі.

*Па матэрыялах прэс-канферэнцыі кампаніі "Інтэл"*

НАПЯРЭДАДНІ

## Ізноў пра лекі

20 і 21 кастрычніка ва універсітэце плануецца правесці міжнародны сімпозіум на тэму "Лекавыя прэпараты на аснове мадыфікаваных поліцукрыдаў". Сярод арганізатараў мерапрыемства — НДІ фізіка-хімічных праблем, канцэрн "Белбіяфарм", Беларускае хімічнае таварыства імя Мендзялеева, Барысаўскі завод медпрэпаратаў, "Белмедпрэпараты". На сімпозіум запрошаны госці з прыбалтыйскіх краін, Расіі, Украіны, Польшчы.

СЛУЖБА 01

## Асцерагайцеся пажараў

У бягучым годзе ў горадзе абвастрылася абстаноўка з пажарамі. За няпоўныя 9 месяцаў 1998 года ў Мінску загінулі 39 і атрымалі траўмы больш за 60 чалавек. Гэта ў два разы болей, чым за аналагічны перыяд мінулага года. Матэрыяльны ўрон, нанесены пажарамі, склаў больш за 27 млрд. рублёў. Агонь знішчыў 55 жылых будынкаў, пашкодзіў 170 адзінак аўтатранспартнай тэхнікі.

У мэтах прадухілення далейшага росту ліку загінулых на пажарах з 1 кастрычніка па 1 лістапада гэтага года Мінскім гарадскім упраўленнем ваенізаванай пажарнай службы Мінгарвыканкама праводзіцца месячнік пажарнай бяспекі. Ён уключае ў сябе комплекс арганізацыйных і практычных мерапрыемстваў супрацьпажарнай скіраванасці, актуальных пры пераходзе да ацяпляльнага сезона. Мэты месячніка — зніжэнне колькасці пажараў, матэрыяльнага ўрону, а таксама інфармаванне шырокага кола насельніцтва аб асноўных правілах і патрабаваннях пажарнай бяспекі.

Штогод з пачаткам ацяпляльнага сезона павялічваецца колькасць пажараў, звязаных з няспраўным ацяпленнем. Часта старыя, няспраўныя печкі і ацяпляльныя катлы, саматробныя электранагравальныя прыборы і прылады з'яўляюцца прычынай узнікнення пажараў. Памятайце, што, карыстаючыся самаробнымі электранагрывальнымі прыборамі, ацяпляльнымі печкамі, якія маюць дымаходы з асбестацэментных і металічных труб, з пашкоджаннямі і расколінамі ў канструкцыях, вы падлягаеце рэальнай небяспецы.

*С. ГЛУХАЎ, інжынер АВПС-9 Маскоўскага раёна г.Мінска*

РЫХТУЙЦЕСЯ ЗАГАДЗЯ

## Прадказваюць халодную зіму

Паводле даных Нацыянальнага навукова-даследчага цэнтра маніторынгу азанасферы, на мінулым тыдні агульнае атрыманне азону ў атмасферы над тэрыторыяй рэспублікі заставалася ў межах кліматычнай нормы і складала 280-290 адзінак Добсана. Такія паказчыкі тыповыя для сярэдзіны восені ў нашым рэгіёне. Яны абумоўлены характарам атмасфернай цыркуляцыі ў гэты перыяд года. Як паказвае практыка, трэба чакаць павелічэння агульнага ўтрымання азону ў нашых шыротах у лістападзе.

Гадавы ход азону і сінаптычныя ўмовы ў паўночным паўшар'і сёлета адрозніваліся ад папярэдніх гадоў. Кліматычныя прагнозы на зімовы перыяд абяцаюць больш нізкія, чым звычайна, тэмпературы. Магчыма, што агульнае ўтрыманне азону ў гэты перыяд будзе адрознівацца ад сярэднекліматычнай нормы. Як павядзе сябе ў далейшым азонавы слой над тэрыторыяй рэспублікі, пакажуць вынікі вымярэнняў.

*БЕЛТА*

ВАКОЛ СВЕТУ

# НЕЗВЫЧАЙНАЯ ВАНДРОЎКА

*Напрыканцы лета група аднадумцаў, сярод якіх былі і супрацоўнікі Беларускага дзяржаўнага універсітэта, наведала Іспанію. Гэта была не зусім звычайная паездка па слядах Аляксандра Міхайлавіча Люцко, былога рэктара каледжа Радыяцыйнай бяспекі імя Сахарава. Год таму шлях на гару Валета стаў для Аляксандра Міхайлавіча апошнім. Карэспандэнт «Беларускага універсітэта» сустрэўся пасля вандроўкі з Верай Акімаўнай Прокашавай, дацэнтам кафедры агульнай матэматыкі і інфарматыкі механіка-матэматычнага факультэта.*

— Спачатку мы прыехалі ў вядомы курортны гарадок Іспаніі Ларэт-дэ-Мар, размешчаны недалёка ад Барселоны. А пасля, праз нейкі час, узялі напракат мікрааўтобус і рушылі праз усю Іспанію з поўначы на поўдзень. Такім чынам, праехалі аж 2580 кіламетраў...

З вадзіцелем нам пашанцавала. Яніс Вілелья каля 25 гадоў жыў у Маскве, 13 — у Іспаніі. Мастак. Цудоўна размаўляе па-руску. Частку дарогі я сама была за рулём. Сказаць па шчырасці, складана ездзіць па звілістых горных дарогах.

Нашай мэтай было ўзыходжанне на гару Валета вышынёй 3428 метраў — другую вяршыню Іспаніі. Гэта горны масіў С'ера-Невада.

Каля падножжа гары Валета на адным з камянёў ушанавалі памяць сябра: умуравалі сімвал усіх вандроўнікаў — ружу вятроў — і ягоны фотаздымак.

На саму гару ўзыходзілі шэсць чалавек. Жонка Аляксандра Міхайлавіча Люцко — Валерыя Андрэеўна Мамантава, іх дачка Таццяна Люцко, біёлаг-даследчык Луіза Мікалаеўна Проп. Усе яны, дарэчы, жывуць ва Уладзівастоку. З універсітэцкіх, акрамя мяне, была Ірына Міхайлаўна Капашова, дацэнт факультэта радыёфізікі і электронікі, быў яшчэ адзін доктар з Бабруйска — Наталля Аляксандраўна Сіманенка.



Месца ўшанавання памяці сябра А. М. Люцко



Так цвіце агава



Сабор у горадзе Тарагона

**— Вы праехалі праз усю краіну... Што найбольш уразіла?**

— Трапляліся на нашым шляху і зялёныя горы, і пустынныя, і аліўкавыя даліны, і персікавыя сады. Праязджалі горныя тэрасы з гароднінай з падведзенай вадой для палівання. Усё гэта было для нас вельмі цікава.

Былі ў Барселоне. Вельмі ўразілі нас славутыя пявучыя фантаны. Наведалі горад Тарагону, дзе яшчэ да нашага часу пад горадам захаваліся падземныя хады. Паглядзелі на раскопкі — месца, дзе вельмі даўно праходзілі бойкі гладыятараў. У Мадрыдзе былі ўначы. Дарэчы, горад вельмі асветлены. І таму для турыстаў няма ніякай праблемы нават ноччу паўдзельнічаць у экскурсіі. Тым больш, што днём там было каля 40 градусаў цеплыні па Цэльсію, ноччу крыху халадней — усяго каля 30.

Бачылі цудоўную кветку агаву, якая цвіце толькі адзін раз за сваё жыццё. Агава падобная да дрэва тым, што дасягае ў вышыню 3-х метраў. Дарэчы, яна пасля таго, як адцвіце, поўнасцю знікае. Толькі па маленькіх адростачках можна здагадацца, дзе калісьці цвіла прыгожая кветка агава.

СПОРТПЛЯЦОЎКА

## Спаборніцтва сярод выкладчыкаў

На першынстве Маскоўскага раёна сярод кіруючых, прафсаюзных і фізкультурных работнікаў вылучыліся выкладчыкі Белдзяржуніверсітэта.

У мятанні гранат перамог прафорг кафедры фізвыхавання Васіль Мікалаевіч Юшко. У адказнага за фізічны факультэт Сяргея Уладзіміравіча Моўчана адразу дзве перамогі: у бегу на 100 метраў і скачках у даўжыню. У забегу на 1000 метраў першым быў Уладзімір Уладзіміравіч Дарафейчык.

## Залатыя горы

На чэмпіянаце горада па гіравым спорце зборная БДУ заняла першае агульнакаманднае месца. «Золата» заваявалі: у вазе 70 кілаграмаў майстар спорту Дзмітрый Баркан (4 курс, фізфак), у вазе 80 кілаграмаў майстар спорту Аляксандр Воўк (2 курс, юрфак), у вазе звыш 100 кілаграмаў Андрэй Атрашкевіч (4 курс, ФМА).

Аляксандр Воўк да таго ж быў другім і ў абсалютнай вагавай катэгорыі.

## Цяжкая хвіліна

На здымках праграмы «Асілак» дзесяць гіравікоў, сярод якіх былі два студэнты БДУ Дзмітрый Баркан і Аляксандр Воўк, за адну хвіліну паднялі ў суме амаль пятнаццаць тон. Дзмітрый Баркан стаў самым першым асілкам сярод прысутных, падняўшы 2016 кілаграмаў, Аляксандр Воўк — трэцім (1728 кілаграмаў).

*Вольга КАЗДЗЕРКА*

# Французскі доктар Фернанд Бакур



Фернанд Бакур, доктар права і гісторыі, дырэктар Цэнтра напалеонаўскіх даследаванняў (ЦНД), працуе са студэнтамі гістарычнага факультэта ўжо з 1995 года. Яго першае знаёмства з факультэтам было амаль выпадковым: Ф. Бакур быў запрошаны для чытання лекцый у Лінгвістычны універсітэт. Але паколькі прачытаная ім перад студэнтамі і выкладчыкамі гістфака лекцыя аб уплыве Французскай рэвалюцыі на грамадска-палітычнае развіццё свету мела поспех, то было вырашана працягнуць супрацоўніцтва.

З таго часу падрыхтаваныя ім невялікія курсы аб крыніцах па гісторыі Беларусі часоў напалеонаўскай эпохі, а таксама «Перадумовы і характар Французскай рэвалюцыі» чытаюцца як архівістам, так і гісторыкам. Напрыканцы курсаў праводзяцца круглыя сталы. Іх гасцямі становяцца супрацоўнікі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, педуніверсітэта, Гродзенскага універсітэта і іншых устаноў Беларусі.

Нельга не адзначыць, што прапанаваны курс мае высокі навуковы ўзровень. Немалая колькасць матэрыялаў упершыню ўведзена ў навуковы зварот менавіта Ф. Бакурам. Для друкавання ў энцыклапедычных выданнях і «Беларускім гістарычным часопісе» ім выяўлена ў Нацыянальным архіве Францыі і апрацавана немалая колькасць невядомых беларускаму боку статыстычных матэрыялаў аб сацыяльна-эканамічным становішчы Віцебска, Гродна, Мінска, Магілёва, Полацка і іншых гарадоў Беларусі ў 1812 годзе. Ён асабіста падрыхтаваў і перадаў для факультэцкай бібліятэкі гістфака дзве часткі навучальнага дапаможніка па агульнай гісторыі Францыі з канца XVIII стагоддзя па 1996 год.

Нельга не адзначыць няўрымслівы характар доктара Ф. Бакура. Ён даволі часты госць універсітэтаў ЗША, запрошаны прафесар дзяржаўнага універсітэта ў Калінінградзе, у Беларусі — Лінгвістычнага і БДУ. У час навуковых канферэнцый ён зрабіў шматлікія даклады ў вядучых універсітэтах Англіі, Германіі, Італіі, Іспаніі ды іншых краін. Доктар Ф. Бакур, умацоўваючы навуковае супрацоўніцтва, разам з аўтарам гэтага артыкула прадстаўляў у Булонскім універсітэце Беларускі дзяржаўны універсітэт на міжнароднай канферэнцыі «Напалеон, Булонь і Еўропа» ў маі сёлета. Зараз разам з ім рыхтуецца на красавік 1999 года канферэнцыя «Французская рэвалюцыя і лёсы свету» на базе гістфака БДУ, удзельнічаць у якой выказалі папярэднюю згоду гісторыкі Францыі (універсітэты Сарбоны, Булоні, Грэнобля), ЗША, Фінляндыі, Германіі, Польшчы, Расіі.

У часопісе «Напалеонаўскія даследаванні», які выдае Ф. Бакур, ён пазнаёміў французскага чытача з гістфакам БДУ, нават надрукаваў здымкі найбольш характэрных момантаў сумеснай працы, сустрэч з выкладчыкамі і студэнтамі.

Пералічэнне яго ганаровых званняў зойме даволі многа месца. Таму адзначым толькі, што ён двойчы лаўрэат Інстытута Францыі, аўтар больш за 200 навуковых прац. У Мінску бывае дастаткова часта — два-тры разы ў год. І пры тым гэты ўжо немалады чалавек звычайна робіць яшчэ два-тры наведванні замежных краін, як сёлета: Расія, ЗША, Кітай.

Мабыць, гэта звязана з тым, што пры дапамозе мясцовых улад ён выявіў, а потым адкрыў памятныя дошкі, помнікі на месцы гістарычных падзей. Так, у красавіку 1996 года на месцы пераправы французскага войска праз раку Беразіну ім пры ўдзеле беларускіх архітэктараў і скульптараў быў пастаўлены помнік у гонар загінулых падчас пераправы. На адкрыцці прыехалі нашчадкі салдатаў французскай арміі.

Зараз Ф. Бакур — зноў наш госць як запрошаны прафесар БДУ. І мы зычым французскаму госцю, каб яго мары аб пашырэнні французска-беларускага супрацоўніцтва на ніве супольнай гістарычнай працы абавязкова здзейсніліся.

*К. І. КАЗАК, дацэнт кафедры крыніцазнаўства і музеязнаўства гістарычнага факультэта БДУ*

*На фота: дэкан гістарычнага факультэта Алег Антонавіч Яноўскі і доктар Фернанд Бакур*

### Расія

## СТУДЭНТЫ РАЗДЗІМАЮЦЬ ГАРАЧУЮ ВОСЕНЬ

1 кастрычніка ў Расіі прайшла першая ўсерасійская студэнцкая акцыя пратэсту, арганізаваная Расійскай асацыяцыяй прафсаюзных арганізацый студэнтаў. Напярэдадні самі студэнцкія лідэры не маглі ацаніць маштабнасць мерапрыемстваў. Па словах кіраўніка асацыяцыі Алега Дзянісава, у страйку павінны былі прыняць удзел ад 70 да 700 тысяч навучэнцаў ВНУ краіны. Па паведамленнях МВД РФ, заяўкі на правядзенне мітынгаў паступілі ў органы ўлады 45 суб'ектаў Федэрацыі.

Па словах прэм'ер-міністра Яўгена Прымакова, абавязацельствы дзяржавы па студэнцкіх стыпендыях на сённяшні дзень выкананы поўнасцю, аднак для студэнтаў сёння важна ўжо не проста атрымаць стыпендыю за лета, але і дабіцца яе індэксацыі ў адпаведнасці з новымі ўмовамі.



### Санкт-Пецярбург

Студэнты і выкладчыкі 20 пецярбургскіх ВНУ прайшлі па Неўскім праспекце да Дварцовай плошчы, дзе адбыўся мітынг. Пратэстоўцы патрабавалі адстаўкі прэзідэнта, выканання законаў аб вышэйшай адукацыі і адукацыі пасля ВНУ, індэксацыі і выплаты стыпендый. На плошчу не выйшлі студэнты Горнага інстытута. Рэктар гэтай навучальнай установы лічыць, што пры яшчэ не сфармаваным урадзе і поўнай безабароннасці сацыяльнага блока выстаўляць студэнтаў як самую бяспраўную і пацярпелую частку насельніцтва было б не зусім справядліва.

### Екацярынбург

Вядомае сваімі веснавымі выступленнямі студэнцтва Екацярынбурга асеннюю акцыю правяло спакойна і арганізавана. Вулічных выступленняў практычна не было, хаця міліцыя, навучаная мінулым вопытам, была гатовая да ўсяго. Ва Уральскім дзяржаўным універсітэце прайшла сустрэча прадстаўнікоў 15 ВНУ горада са старшынёй урада вобласці Аляксеем Вараб'ёвым, а ў Архітэктурнай акадэміі на пытанні студэнтаў адказвалі рэктар і саветнік старшыні абласнога ўрада.

Да кіраўніцтва Расіі, вобласці і мэра Екацярынбурга студэнты звярнуліся з пісьмовымі патрабаваннямі. Сярод іх — захаванне платы за інтэрнат у памеры 15 працэнтаў ад стыпендыі, адмаўленне ад павышэння кошту праязных білетаў, аснашчэнне тэрыторыі студэнцкіх гарадкоў бясплатнымі тэлефонамі-аўтаматамі і рэалізацыя праграмы адраснай сацыяльнай дапамогі малазабяспечаным студэнтам.

### Растоў-на-Доне

Данское студэнцтва ва ўсерасійскую акцыю ў абарону канстытуцыйных правоў навучэнцаў улілося дастаткова законапаслухмяна. Адной з аб'ектыўных прычын гэтага сталі выплаты стыпендый напярэдадні першага кастрычніка. Тым не менш многія студэнты былі настроены вельмі рашуча. У многіх гарадах вобласці яны сустрэлі разуменне і падтрымку прафсаюзаў, якія спрабавалі вырашыць праблему транспартавання ўдзельнікаў студэнцкай акцыі пратэсту ў абласны цэнтр.

### Масква

«Нас утро встречает прохладой»,— спявалі маскоўскія студэнты, весела пакурчваючыся ад нечаканай, як заўсёды, зімы. Асноўным лозунгам мерапрыемства першапачаткова было патрабаванне выплаціць летнюю запазычанасць па стыпендыях. Аднак самы магутны студэнцкі гурт стаяў натоўпам пад фразай «Мы — будучыня, ад будучыні не схаваешся».

У сталіцы зборам будучыні каля Белага дома кіраваў старшыня Расійскай асацыяцыі прафсаюзных арганізацый студэнтаў Алег Дзянісаў. Заяўлялася 20 тысяч чалавек. Улады, спасылаючыся на недахоп плошчаў, выдзелілі пад будучыню 12 тысяч. А на самой справе на мітынг прыйшло не больш за 3 тысячы чалавек, якім хапіла месца на невялікім пятачку.

Грамчэй за ўсіх заявілі пра сябе МДТУ імя Баўмана, у якім не так даўно адключылі святло, і Горны універсітэт, студэнты якога не менш пераканаўча, чым пікетчыкі на Гарбатым мосце, грукалі шахцёрскімі каскамі.

## СТУДЭНТЫ «СТУЧАЦЬ» ПА ТЭЛЕФОНЕ ДАВЕРУ

Апошнім часам адміністрацыя Кемераўскай вобласці актыўна выступае супраць незаконных пабораў у ВНУ, дзе шырока распаўсюдзілася практыка платнай пераздачы залікаў і экзаменаў, а таксама магчымасць аплаціць прагулы лекцый. Студэнты, незадаволеныя незаконнымі паборамі, выбралі даволі своеасаблівую тактыку абароны — усё часцей яны спавядаюцца, набіраючы нумар тэлефона даверу і паведамляючы пра факты вымагальніцтва. Па такіх сігналах у Кемераве і Новакузнецку ўжо ўзбуджаны крымінальныя справы супраць некалькіх выкладчыкаў.

### Ізраіль

## СТУДЭНТЫ ПЕРАВЫХОЎВАЮЦЬ БАНДЫТАЎ

Незвычайны спосаб перавыхавання заканаранелых злачынцаў вынайшлі ў Ізраілі. Ужо больш за год там існуе праграма так званай «сацыяльнай адаптацыі». Яна прынесла фантастычныя вынікі: каля трох чвэрцяў былых зняволеных радыкальна змянілі свой лад жыцця і завязалі са злачынным мінулым.

Сутнасць эксперыменту ў тым, што злачынцы, прыгавораныя да розных тэрмінаў турэмнага зняволення, адбываюць апошні год свайго пакарання ўжо на волі, але ў пэўных умовах. Галоўная з іх — у тым, што былы зэк селіцца ў адной кватэры з двума студэнтамі і абавязаны мець агульны з імі бюджэт, лад жыцця, захапленні. Увогуле, зняволеных прывучаюць да зусім новага для іх жыцця спосабам укаранення.

Студэнтаў — удзельнікаў праграмы зацікавіў фінансавы бок справы. У дадатак да суседа-злачынца яны атрымлівалі ў арэнду вельмі камфартабельную кватэру ў прэстыжным раёне па кошце студэнцкага інтэрната. Апрача таго, многіх хлопцаў з забяспечаных сем'яў да зэкаў вабіла натуральная цікаўнасць. Менавіта таму аўтары праекта і прадугледзелі лікавую перавагу студэнтаў над бандытамі, у адваротным выпадку перавыхаванне магло б пайсці ў супрацьлеглым накірунку. Асабліва давялося папацець паліцыі над тым, каб прыладкаваць двух былых забойцаў, якія адседзелі вялікія тэрміны. Але трывога аказалася дарэмнай. Амаль усе былыя бандыты, гандляры наркотыкамі, хуліганы радаваліся, як дзеці, кожнай жыццёвай дробязі, што адбывалася ў коле трох суседзяў. Некаторыя з іх шчыра перажывалі за поспехі ў навучанні «сваіх» студэнтаў і нават пагражалі наладзіць разборкі прафесуры ў выпадку чаго. Праўда, абыйшлося без эксцэсаў. Правілы сумеснага пражывання абавязвалі былых зняволеных брацъ на сябе палову ўсіх абавязкаў па гаспадарцы. Усе гэтыя побытавыя клопаты настолькі адцягвалі іх ад былых звычак, што аб рэцыдывах злачынстваў і гаворкі не вялося. Нават кепскую звычку ўжываць наркотыкі пакінулі 72 працэнты ўдзельнікаў эксперымента, пры гэтым да «траўкі» не прыахвоціўся ніводзін студэнт.

Вынік цудоўны. 26 былых зняволеных зараз навучаюцца ў розных ізраільскіх ВНУ. 15 зэкаў ажаніліся са студэнткамі.

Праект «кватэра на траіх» стаў сапраўдным адкрыццём. Гэты спосаб выпраўлення адобраны міністэрствам юстыцыі і равінамі. Па вопыт у Ізраіль прыязджалі ўжо вучыцца дэлегацыі з амерыканскіх і галандскіх турмаў. Вельмі верагодна, што гэты праект атрымае шырокае распаўсюджанне і ў іншых краінах.



*Японія*

## СТУДЭНТЫ РЫХТУЮЦЦА АТРЫМАЦЬ МІЛЬЁН

У школе кэйрына ў Сюдзендзі кожны занятак па механіцы пачынаецца з рытуальнага паклону настаўніку ў духу канфуцыянскіх традыцый. Тут студэнты вучацца не толькі разбіраць і рамантаваць ровар, але і дамагацца гармоніі цела, духу і тэхнікі.

Пры кепскім надвор'і трэніроўкі навучэнцаў праводзяцца ў памяшканні. За кепскія вынікі іх сурова караюць. Напрыклад, прымушаюць несці свой ровар на выцягнутых руках за тое, што занадта павольна ехаў у час трэніроўкі. Вось вам пакаранне, якое абавязкова прынясе карысць — студэнт будзе мацнейшым. Увогуле фізічная загартоўка — адзін з галоўных накірункаў школьнай праграмы. Трэніроўкі доўжацца некалькі гадзін.

Калі ты парушыў рэжым, цябе не сякуць віцамі, а б'юць бамбукавымі палкамі — гэта традыцыйны від пакарання. «Нашы навучэнцы павінны не толькі навучацца майстэрству кэйрын, але і выпрацаваць бездакорную сістэму каштоўнасцей. Інакш яны нічога не дамогуцца ў жыцці», — кажа дырэктар школы Іцуа Надзуна, тлумачачы строгасць выкладчыкаў.

Навучэнцы практычна адрэзаны ад навакольнага свету. Яны маюць права званіць блізкім толькі ў пэўны час. За дзесяць месяцаў навучання ім прадастаўляецца толькі дзесяць дзён адпачынку.

Перад стартам спартсмен спрабуе засяродзіцца, па-будыйску кланяючыся свайму ровару. Іншыя ўдзельнікі гонак — прыхільнікі рэлігійнай традыцыі шынто — раскідваюць вакол сваёй спартыўнай прылады соль, здзяйсняючы абрад ачышчэння.

Паводзіны ўдзельнікаў кэйрына строга рэгламентуюцца. Кожны з іх павінен да пачатку гонкі выкласці сапернікам сваю тактыку. Гоншчыкі распрацоўваюць яе самі: трэнераў у іх няма. Кваліфікацыйныя заезды праводзяцца кожны тыдзень. Яны доўжацца каля шасці гадзін. Гледачы назіраюць за гонкай с трыбун, абсталяваных індывідуальнымі столікамі і камфартабельнымі крэсламі.

Пераможца кожнага заезду атрымлівае неблагі ганарар. Часам яго сума перавышае пяцьсот тысяч даляраў. Дзеля перамогі ўдзельнікі спаборніцтваў гатовыя на ўсё. Сур'ёзныя траўмы — звычайная з'ява на трэку, але смяротныя вынікі бываюць крайне рэдка. Шматлікія суддзі сочаць за захаваннем правілаў і за паводзінамі спартсменаў.



# Гімн чалавечай руцэ



Свет рэчаў навокал нас створаны рукамі. Усё, з чым мы сутыкаемся ў паўсядзённым жыцці, без чаго не маглі б існаваць — ад элементарных прыладаў да камп'ютэрных сістэм, — стварылі чалавечыя рукі. Рука — самы дасканалы інструмент, якім валодае чалавецтва.

Чалавек не задумваецца над тым, як ён ходзіць. З тым жа звыклым аўтаматызмам ён карыстаецца рукой як інструментам. Аднак дастаткова хоць раз звярнуць увагу на шматстайнасць функцый, якія выконвае нашая пярэдняя канечнасць, каб зразумець, якім цудам прыроды мы валодаем. Рука не толькі хапае, узнімае, трымае, кідае, ловіць (гэты шэраг можна доўжыць да бясконцасці), рука — гэта унікальны орган адчування, здольны да найменшых нюансаў ацаніць паверхню і фактуру любога прадмета. На кончыку кожнага пальца — тысячы звязаных з мозгам датыкальных клетак, якія рэагуюць на сілу ціску, тэмпературу, боль. Усе ніці кіравання і каардынацыі работы пальцаў, звязак, суставаў і костак вядуць у мозг. Прыблізна трэцяя частка мазгавых цэнтраў, якія адказваюць за нашы рухі, непасрэдна звязана з рукамі. Што ж датычыцца нагі, інструмента для нашых малпападобных продкаў не менш важнага, то для яе ў мысліцельным апараце адведзена месца не болей, чым для двух пальцаў рукі. Работа рукі кантралюецца таксама і зрокам: вочы адыгрываюць важную ролю ў сітуацыях, калі трэба ўзяць прадмет і знайсці для яго новае месца.

Наколькі тонка ўзаемадзейнічаюць рухальны апарат і нашыя пачуцці, паказваюць вопыты, праведзеныя канадскімі даследчыкамі. Удзельнікі эксперыменту пры дапамозе вялікага і ўказальнага пальцаў узнімалі розныя па вазе і фактуры цыліндры. Высветлілася, што моц хваткі ў роўнай ступені залежыць як ад вагі, так і ад фактуры. Другая даследчыцкая група, з нямецкага горада Кіля, прыйшла да не менш цікавай высновы: кожны хапальны рух падзяляецца на два кампаненты — набліжэнне да прадмета і яго захоп, прычым абедзве праграмы кіруюць мозгам зусім незалежна адна ад адной.

У прынцыпе, існуюць два асноўныя тыпы рухаў рук. Першы тып — гэта рухі, якія кіруюцца пры дапамозе зваротнай сувязі. Сюды ўключаюцца разнастайныя філігранныя аперацыі, якія робіць рука. Другі тып — балістычныя рухі, якія раскручваюцца нібы па гатовай праграме. Такія рухі вельмі хуткія, але мадыфікаваць іх цяжка, і яны не вызначаюцца стопрацэнтнай дакладнасцю — калі, напрыклад, мы ловім мяч ці наносім удар. Гэтым рухам кошка ловіць птушку. Ад ста да двухсот мілісекунд патрабуецца на тое, каб праграма руху сфармавалася ў кары галаўнога мозга, была перададзена мускулам і прыняла іх у рух. Таму кошка і выкідае лапы туды, дзе чакае з'яўлення птушкі, толькі праз 200 мілісекунд. Для таго, каб уносіць апошнія карэктывы ў гэтую праграму, кошка надзеленая яшчэ і «суперхуткаснай сувяззю» між лапай і вокам.

### ХТО ЛЕПЕЙ: ПРАЎШУН ЦІ ЛЯЎШУН?

Структура нашага мозга актыўна ўплывае і на тое, якой рукой мы схіляемся дзейнічаць. Правае, «творчае», паўшар'е кіруе левай рукой. Магчыма, таму многія вялікія мастакі — ляўшуны. У спісе вялікіх леўшуноў мы знаходзім імёны Леанарда да Вінчы, Мікеланджэла, Гальбэйна і больш блізкіх да нас у часе Паўля Клее, Пабла Пікаса, Чарлі Чапліна, Пола Макартні. Ужо Платон і Русо змагаліся за ўзаконенне правой левай рукі, але і яны не перамаглі ўкаранёныя забабоны: «правы» — сінонім слоў «правільны, добры», правільна тое, што зроблена правай рукой. «Левы», наадварот, у многіх мовах, рэлігіях і культурах — «несправядлівы», ляўшун часам увогуле лічыцца «пасланцом д'ябла». Як паказваюць працы расійскіх і англійскіх навукоўцаў, якія аналізавалі зрэзы і сколы старажытных каменных прыладаў, гома сапіенс ужо больш за 2 мільёны гадоў таму быў праўшуном. Гэта пацвярджаюць і іншыя даследаванні. Жывёлы, выконваючы складаныя рухі лапамі, таксама схіляюцца да аднабаковасці. Калі, напрыклад, пакласці палоску паперы на галаву рапухі буфобуфо, то яна пастараецца спіхнуць яе правай лапкай. У якой ступені схільнасць да вядучай ролі той ці іншай рукі перадаецца па спадчыннасці, пакуль дакладна не вызначана. Канадскія навукоўцы прыйшлі да высновы, што леварукасць перадаецца па лініі маці, але пры гэтым дзіця звычайна нараджаецца праўшуном, калі абодва бацькі — леўшуны. Прычынай левабаковасці можа быць і розная ступень развіцця паўшар'яў мозга. Сярод леўшуноў асабліва многа людзей тых прафесій, для якіх патрабуюцца творчыя асацыятыўныя здольнасці, што вызначаюцца правым паўшар'ем.

Крыміналістыка таксама не абмінае гэтую тэму. Не толькі «кароль рэвальвера» Білі Кід любіў страляць левай рукой. Паводле статыстыкі, сярод малалетніх злачынцаў леўшуноў удвая больш, чым тых, хто дзейнічае правай. Сярод людзей, якія пакутуюць на заіканне, начное нетрыманне мачы, сярод шызафрэнікаў і разумова адсталых людзей леўшуноў таксама несувымерна многа. Відаць, абедзве крайнасці — геніяльнасць і вар'яцтва — часцей сустракаюцца ў леўшуноў.

### УНІВЕРСАЛЬНАЯ МОВА ЖЭСТАЎ

З пункту гледжання заамарфалогіі, істотных адрозненняў між магчымасцямі чалавечай рукі і лапай малпы няма. Чалавек бярэ дробны прадмет кончыкамі вялікага і ўказальнага пальцаў, і шымпанзе робіць гэтаксама, але з меншым спрытам, — вось і ўся розніца. Аднак калі пералічыць усё, што чалавечая рука можа апрача хапання, стане зразумела, наколькі далёка мы сышлі ад сваіх продкаў, якія лазілі па дрэвах. Найбольш красамоўна пра гэта сведчыць мова, якой карыстаюцца глуханямыя, — мова жэстаў. У гэтай мове рукі поўнасцю бяруць на сябе функцыі гукавога маўлення. Але і проста размаўляючы адзін з адным, мы ўсё адно дапамагаем сабе рукамі. Жэст, як правіла, спадарожнічае слоўнаму тлумачэнню. Паспрабуйце, напрыклад, патлумачыць дзіцяці, што такое вінтавая лесвіца, і вы ўбачыце, як вашая рука пачне энергічна маляваць у паветры петлі серпанціна. Маўленне і жэстыкуляцыя трывала звязаны ў нашым мозгу. Людзі, якім у час эксперыменту забаранялася суправаджаць гаворку рухам рук, казалі менш выразна, млява, з цяжкасцю фармулявалі думку і блыталі асобныя паняцці.

Актыўная жэстыкуляцыя — незаменны памочнік маўлення, калі аратару даводзіцца выступаць на далёкай адлегласці ад публікі. Таму акторы на сцэне жэстыкулююць актыўней, чым у кіно. Адольф Гітлер браў у 20-я гады ўрокі ў актора Базіля, які граў у прыдворным тэатры гераічныя ролі. Верагодна, у яго будучы фюрэр навучыўся працаваць рукі да слухачоў і прывабліваць іх хутчэй жэстамі, чым аргументамі.

Жэсты выдаюць чалавека, калі ён хлусіць. Гледачы, якім далі заданне выказваць захапленне ад загадзя бездапаможнага фільма, выдавалі сябе невыразнасцю жэстыкуляцыі і яе малой колькасцю. Па некаторых не залежных ад слоў рухах, кшталту пастукванне пальцамі па стале, мы можам меркаваць аб унутраным стане суразмоўцы, адгадваем добразычлівасць ці пагрозу, якія сыходзяць ад яго. Іншыя рухі, напрыклад, пачуханне патыліцы, сведчаць аб недахопе слоў ці сарамяжлівасці гаворачага. Можа быць, у гэтым жэсце закладзена таксама падсвядомая спроба стымуляваць мозг.

Гэтымі пытаннямі займаецца псіхалогія жэстаў. Яна, аднак, зусім бяссільная перад загадкай таго, як менавіта мозг кантралюе рухі рук і ўключае іх у кантэкст паводзінаў і маўлення. Атрымліваецца, што мы прыблізна ўяўляем сабе сувязь маторыкі з абстрактным мысленнем і дотыкам, але як і дзякуючы чаму дзейнічае гэтая сувязь — застаецца для нас таямніцай за сямю пячаткамі.

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Заснавальнік газеты — БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ

Газета зарэгістравана Дзяржаўным камітэтам Рэспублікі Беларусь па друку. Рэгістрацыйнае пасведчанне №149 ад 28 чэрвеня 1996 года.

Газета надрукавана ў Выдавецкім цэнтры Белдзяржуніверсітэта 220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6
Ум. друк. арк. 1
Падпісана ў друк у 12.00

15 КАСТРЫЧНІКА
Зак. 614
Т. 1000 экз.

Адрас рэдакцыі: 220080, Мінск-80, Універсітэцкі гарадок, вул. Бабруйская, 9, паверх 3, пакой 307, тэлефон 2206827.

Рэдактар М. Г. ЗАГОРСКАЯ

Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР

Камп'ютэрная вёрстка Крывадубскай А.У.